Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 4 (513) | Субота, 9 лютага 1963 г. | Цана 1 кап. | Год выдання XVI-ы

## *На акруговай передвыбарнай нарадзе*

Вечарам 5 лютага ў клубе імя Дзяржынскага адбылася перадвыбарная нарада прадстаўнікоў працоўных Ленінскай выбарчай акругі г. Мінска па выбарах у Вярхоўны Савет Беларускай ССР.

Кароткім уступным словам нараду адкрыў сакратар Ленінскага райкома партыі Г. Я. Цыганкоў.

Прапанову аб вылучэнні кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР тав. К. Т. Мазурава горача падтрымалі прафесар Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна В. І. Сцяпанаў, дырэктар «Мінскпраекта» І. І. Ляўко, салдат Э. П. Хадорчанка, выбаршчык Н. І. Кірыленка, работніца фабрыкі № 1 «Індпашыўадзення» Т. В. Шымановіч, сакратар Ленінскага РК ЛКСМБ І. М. Пермякова.

У аднадушна прынятай пастанове ўдзельнікі перадвыбарнай нарады горача падтрымалі вылучэнне кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета Беларускай ССР па Ленінскай выбарчай акрузе г. Мінска кандыдата ў члены Прэзідыума ЦК КПСС, першага сакратара ЦК КП Беларусі Кірылы Трафімавіча Мазурава. Яны звярнуліся да акруговай выбарчай камісіі з просьбай зарэгістраваць Кірылу Трафімавіча Мазурава кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета Беларускай ССР па Ленінскай выбарчай акрузе г. Мінска па выбарах у Вярхоўны Савет БССР.

Акруговая перадвыбарная нарада прыняла зварот да ўсіх выбаршчыкаў Ленінскай выбарчай акругі, а таксама выбрала даверaных асоб.

**Насустрач выбарам у Вярхоўны Савет БССР і ў мясцовыя Саветы Беларускай ССР**

## Вечары, сустрэчы, лекцыі

З набліжэннем дня выбараў у Вярхоўны Савет БССР і ў мясцовыя Саветы Беларускай ССР усё шырэй разгортваецца перадвыбарная кампанія сярод студэнтаў, аспірантаў і прафесарска-выкладчыцкіх работнікаў Беларускага дзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна. У падрыхтоўцы да выбараў актыўны ўдзел прымаюць партыйныя, камсамольскія, прафсаюзныя арганізацыі факультэтаў, кафедры грамадскіх навук. Акрамя перадвыбарных сходаў, якія прысвячаліся вылучэнню кандыдатаў у Цэнтральную выбарчую камісію па выбарах у Вярхоўны Савет БССР і кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР, у сценах універсітэта сістэматычна праводзяцца разнастайныя вечары, канферэнцыі, сустрэчы са знатнымі людзьмі.

Так, асаблівую ўвагу малады выбаршчыкаў прыцягнула арганізаваная кафедрамі філасофіі, гісторыі Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і палітычнай эканоміі сустрэча студэнтаў і выкладчыкаў з удзельнікамі гераічных баёў пад Валгаградам. Генерал-маёр у адстаўцы Аляксандр Васільевіч Кірсанаў, як удзельнік гераічнай эпапеі, расказаў сабраўшымся выбаршчыкам, як абаранялі савецкія воіны горад на Волзе, як перайшлі ў контрнаступленне і разграмілі ворага. У той грозны час на фронце знаходзіўся Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў. Аляксандр Васільевіч успамінае аб двух сустрэчах з членам Ваеннага Савета фронта і аб тым, якую чуласць, клопаты да воінаў праяўляў Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў.

У гуманітарным корпусе разгарнуў шырокую агітацыйную работу агітпункт выбарчага участка № 18 Ленінскага раёна. Вось як ён будуе сваю работу. Пры ўваходзе ў агітпункт кідаецца ў вочы прыгожа аформленая шыльда: «У нас сёння ў агітпункце...». Кожны дзень тут што-небудзь цікавае праводзіцца: вечары, лекцыі, кансультацыі. Загадчык агітпункта Людміла Аляксандраўна Прыходзька і загадчык агітkалектыву Яўгенія Васільеўна Петушкова, улічваючы запатрабаванні моладзі, плануюць і праводзяць такія мерапрыемствы, якія захапляюць і цікавяць менавіта моладзь. Па заяўках моладзі, у бліжэйшы час на агітпункце будзе праведзен вечар на тэму «Эстэтыка ў быце».

Не менш прывабна і ўтульна выглядае і ўнутранае ўбранне агітпункта. На сценах — стэнды, прысвечаныя рашэнням лістападаўскага Пленума ЦК КПСС, дыяграмы, лозунгі, плакаты. На сталах — выбарчая літаратура, газеты, часопісы, настольныя ігры. У агітпункце ўстаноўлен тэлевізар.

Маладыя выбаршчыкі ахвотна наведваюць гэты агітпункт.

**В. Купрыенка,**
аспірант.

## Рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР

У рэспубліцы 6 лютага пачалася рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

У прысутнасці прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый адбылося пасяджэнне акруговай камісіі Ленінскай выбарчай акругі горада Мінска па выбарах у Вярхоўны Савет БССР. Камісія прыняла рашэнне зарэгістраваць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета Беларускай ССР па Ленінскай выбарчай акрузе кандыдата ў члены Прэзідыума ЦК КПСС, першага сакратара ЦК КП Беларусі **Кірылу Трафімавіча Мазурава.**

Па Дабралюбаўскай выбарчай акрузе горада Мінска кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР зарэгістраван рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, акадэмік Акадэміі навук БССР **Антон Нікіфаравіч Сеўчанка.**

(БЕЛТА).

## *ЗАКОНЧЫЛАСЯ СЕСІЯ ЗАВОЧНІКАЎ*

На завочных аддзяленнях факультэтаў закончыўся адказны перыяд — студэнты здавалі зімовую экзаменацыйную сесію.

Шмат цяжкасцей пераадольвае завочнік, пакуль ён скончыць навучанне і атрымае вышэйшую адукацыю. Стомлены дзённай працай на заводзе ці фабрыцы, у школе, ва ўстанове, студэнт-завочнік увечары садзіцца за кнігу — чытае літаратуру, піша курсавую або кантрольную работу. Ён жа толькі такім чынам можа паказаць свае веды ў межсесійны перыяд, тады калі студэнт стацыянара робіць гэта на практычных і семінарскіх занятках. І толькі двойчы ў год завочнік прыязджае на экзаменацыйную сесію. За гэты кароткі тэрмін трэба паспець зрабіць вельмі ўжо шмат: здаць чарговыя экзамены, праслухаць лекцыі па дысцыплінах наступнага семестра, здаць у бібліятэку кнігі і атрымаць на новы семестр. Ды і шмат яшчэ якіх спраў у завочніка набіраецца на сесійныя дні!

Далёка не ўсе лекцыі могуць задаволіць слухачоў- завочнікаў. Звычайна курс, які ім чытаюць, бывае карацей, чым у стацыянарнікаў, у некалькі разоў. Таму выкладчыкам прыходзіцца даваць самае галоўнае, асноўныя тэарэтычныя палажэнні. І часта атрымліваецца так, што лектар знаёміць студэнтаў толькі з асобнымі раздзеламі курса, які ён чытаў для студэнтаў стацыянара. Значыць, у канспектах завочнікаў выпадаюць цэлыя раздзелы, [illegible] пытанняў застаецца незразуме[illegible]мі. Нярэдка ў час экзаменаў здараецца, што ў экзаменацыйных білетах ёсць пытанні, аб якіх завочнік нават не чуў. Такую няправільную практыку чытання лекцый асобнымі выкладчыкамі трэба ліквідаваць.

Цяпер, калі да завочнага навучання прад'яўляюцца асабліва высокія патрабаванні, трэба зрабіць усё магчымае, каб студэнты набылі тут глыбокія веды і, атрымаўшы дыплом выпускніка БДУ, сталі добрымі настаўнікамі, матэматыкамі, гісторыкамі, фізікамі, філолагамі, сталі высокакваліфікаванымі спецыялістамі.

Нашы інтэрв'ю

## Як вы правялі свой выхадны дзень?

Такое пытанне задаў наш спецыяльны карэспандэнт **Георгій Огій** студэнтам фізічнага факультэта. Вось што яны адказалі:

**Эдуард РАМАНКО (3 курс)**

Я з дзяцінства захапляюся лыжным спортам. Вось і ў гэтую нядзелю я зрабіў прагулку за парк імя Чэлюскінцаў. Чыстае паветра, цудоўная мясцовасць. Дадому я вярнуўся бадзёры і энергічны.

**Раіса ГАНЧАРОВА (4 курс)**

Разам з аднакурснікамі Віктарам Мартосам, Мікалаем Сахаравым рыхтавалася ў бібліятэцы імя Леніна да экзамена па педагогіцы. Увечары ўсім нашым пакоем чыталі кнігу В. Аксёнава «Апельсіны з Марока». Чыталі па чарзе, потым дзяліліся сваімі думкамі, уражаннямі. Спрачаліся аж да двух гадзін. Дарэчы, мы часта наладжваем такія чыткі кніг

**Валянцін ЛУЦЫБА (4 курс)**

Рыхтаваўся да надыходзячай сесіі. Гэта, бадай, апошняя наша сесія ва універсітэце. Пасля яе мы ідзём на практыку на цэлы год. Раз'язджаемся хто-куды — у Маскву, Ленінград, некаторыя застаюцца ў Мінску. Цяпер у нас перыяд упартай падрыхтоўкі да экзаменаў.

**Пётр МАЙРАКАЎ (4 курс)**

Рыхтуюся да наступнага семестра. Перачытваю слабыя месцы, каб не было прабелаў у ведах.

**Карлос ФІГЕРЭДО (1 курс)**

3 лютага мы сустракалі сваіх землякоў, якія займаюцца ў Баку, набываюць спецыяльнасць інжынераў нафтавай прамысловасці. Прыехалі каля дваццаці чалавек. Яны будуць у нас у гасцях некалькі дзён.

**Хасэ ГОМЕС (1 курс)**

Увечары адбылася сустрэча з артыстамі Опернага тэатра. Вельмі спадабалася

## У вну краіны

### Расце сям'я майстроў

Закончыліся спаборніцтвы на асабіста- каманднае першынство Малдаўскай рэспублікі па самба. У іх прынялі ўдзел і спартсмены нашага інстытута Мацарын, Дзізенка і Паладзі.

Заваёўваць перамогу было нялёгка. Сабраўшы ўсю энергію і волю, упарта змагаўся студэнт будаўнічага факультэта, трэцякурснік Г. Паладзі. Пасля некалькіх паядынкаў ён выйшаў на трэцяе месца. Адначасова юнак выканаў норму майстра спорту СССР.

**(«КАДРИ БУДОВАМ». Шматтыражная газета Адэскага інжынерна-будаўнічага інстытута).**

### Прыз — радыёла

Вось ужо другі год жывуць у інтэрнаце № 5 студэнткі 3 курса В. Клетчанка, Р. Шыбнева, Н. Малайчына, В. Екіменка, Н. Афонькіна. У журнале санітарнага стану іх пакою № 72 заўсёды толькі выдатныя адзнакі. За ўзорную чысціню і парадак дзяўчынам уручаны пераходны прыз інтэрната— радыёла Р-7.

**(«СОВЕТСКИЙ СТУДЕНТ». Шматтыражная газета Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі).**

### Яшчэ адна доктарская

У савеце аддзялення грамадскіх навук АН УССР загадчыкам кафедры галіновых эканомік Кішынёўскага універсітэта М. М. Макеенка адначасова абаронена дысертацыя на атрыманне вучонай ступені доктара эканамічных навук па манаграфіі «Нарыс развіцця машынабудаўніцтва СССР у 1921—1928 гг.»

**(«КИШИНЕВСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ». Шматтыражная газета Кішынёўскага дзяржуніверсітэта).**

## *Турысцкімі сцежкамі*

Вось і закончыліся зімовыя канікулы. Але яшчэ доўга будуць памятаць іх многія студэнты універсітэта, асабліва тыя, хто правёў гэтыя дні ў турысцкіх паходах па прасторах Радзімы. 300 студэнтаў удзельнічалі ў агітпрабегу па рэспубліцы. Яны праводзілі ў калгасных клубах, дамах культуры лекцыі і гутаркі, чыталі даклады, выступалі з канцэртамі мастацкай самадзейнасці.

Турысцкія групы пабывалі на Валдайскім узвышшы, у Архангельскай вобласці і на Кольскім паўвостраве. на Карпацкіх гарах.

**В. Налімаў.**

